# Чыста там, дзе не смецяць



**Работнікі Шчучынскага лясніцтва і інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя прынялі ўдзел у акцыі “Чысты лес”, якая па ініцыятве Міністэрства лясной гаспадаркі праводзілася ў нашай рэспубліцы пяты раз.**

Работнікі лесу пастаянна сочаць за чысцінёй у лясных масівах, вызваляюць іх ад бытавога смецця, якое бессаромныя грамадзяне спецыяльна вязуць у лес або пакідаюць пасля адпачынку. На гэты раз удзельнікі акцыі наводзілі парадак непадалёку аўтакалоны – у прыгожым лясным куточку, куды часцяком выбіраюцца на выхадныя гараджане. Збіралі пластыкавыя бутэлькі, упакоўкі і іншае смецце...



– У лясной галіне я працую сорак год і магу з упэўненасцю сказаць, што раней лясы былі чысцейшымі, – сцвярджае майстар Шчучынскага лясніцтва Станіслаў Міхайлавіч Крупіца. – Людзі аберагалі лясныя ўгоддзі, адносіліся да іх з большай пашанай. Цяпер часам даводзіцца вывозіць цэлыя звалкі. На маю думку, гэту праблему вырашыць можна, толькі трэба ў месцах адпачынку расстаўляць кантэйнеры для збору смецця. І ўздоўж дарогі М6 таксама яны былі б вельмі дарэчы.

Згодны з ім і начальнік інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр Валянцінавіч Сушчэвіч.

– Наш святы абавязак – аберагаць прыроду, а не знішчаць яе. Такія акцыі праводзяцца для таго, каб яшчэ раз засяродзіць увагу ўсіх беларусаў на праблеме забруджвання лясоў. Чысціня ў гэтым храме прыроды залежыць ад кожнага з нас.

**Ганна РУДСКАЯ.**
**Фота аўтара.**